УДК 316.46

# ПСІХАЛАГІЧНАЕ ПАРТРЭТАВАННЕ КУРСАНТА Ў СІСТЭМЕ МУС: МАТЫВАЦЫЙНАЯ СФЕРА

***І. А. Качанаў*** (Магілёўскі інстытут МУС РБ)
Навук. кір. ***С. В. Венідзіктаў***,
канд. філал. навук, дацэнт

Мэтай даследавання з’яўляецца выяўленне спсцыфічных асноў фарміравання матывацыйных кампанентаў, актуальных для курсантаў устаноў адукацыі сістэмы МУС. Выкарыстоўваюцца метады анкетнага апытання, другаснага аналізу вынікаў сацыялагічных даследаванняў, метады экстрапаляцыі і аналізу. На базе Магілёўскага інстытута МУС было праведзена анкетаванне [1] курсантаў, дапоўненае ўключаным назіраннем.

Развіццё матывацыйнай сферы звязана з агульным сацыяльна-камунікатыўным развіццём асобы і складаецца па крытэрыях наступных раздзелаў: сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі; дамінуючыя сферы дзейнасці; знешнія характарыстыкі; камунікатыўныя якасці [1].

Падчас анкетавання быў выяўлены шэраг аспектаў: напрыклад, курсантаў да паступлення ў ведамасны інстытут аб’ядноўвала толькі жаданне паступіць ва ўстанову вышэйшай адукацыі. Шэраг апытаных адзначыў у якасці асноўнай праблемы цяжкасці з засваеннем спецыялізаваных навучальных дысцыплін, складанасці з распарадкам дня і службовай дысцыплінай. Большасць курсантаў паступіла ў інстытут ва ўзросце 17-19 гадоў, што можа з’яўляцца сур’ёзнай праблемай пры вызначэнні дамінуючых матываў навучання, самаідэнтыфікацыі ў абранай прафесіі, імкненні да прафесійнага станаўлення. Таксама было выяўлена, што частка апытаных выразна не могуць вызначыць свае матывы паступлення ў інстытут, што можа сведчыць аб іх сацыяльнай нясталасці і інфантыльнасці, спантаннасці ў выбары навучальнай установы. Лічым, што такія высновы непасрэдна звязаны з узроставымі і сацыяльна-камунікатыўнымі асаблівасцямі курсантаў.

Курсанты з’яўляюцца суб’ектамі досыць спецыфічнай дзейнасці – службы ў органах унутраных спраў. Спецыфіка выяўляецца не толькі ў службовай дзейнасці, але і ў тым, што яны (курсанты) “ўступаюць у прафесію” з розных сацыяльных умоў, з рознымі індывідуальнымі чаканнямі, у выніку чаго матывацыйнае станаўленне супрацоўнікаў не можа быць апісана ў рамках адной дамінуючай мадэлі.

### Літаратура

1. Психологические тесты для профессионалов / авт. сост. Н. Ф. Гребень. – Минск : Соврем. школа, 2007. – 496 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова